# РАВЕСНІКІ

**Якія яны, народжаныя ў новым стагоддзі, больш за тое — у новым тысячагоддзі? Мы, старэйшыя, насцярожана назіраючы, як яны становяцца дарослыя, стараемся іх зразумець, прыдумляем ім вобразныя назвы кшталту «пакаленне вялікага пальца», «пакаленне Z». Зайздросцім іх уменню прыстасавацца да ўсяго новага, спрабуем спасцігнуць іх «кліпавае мысленне». Нярэдка наракаем: яны не такія, як мы!**
**Так, яны не такія, як мы. Хоць бы таму, што яны не мы, яны нашы дзеці і ўнукі. І растуць яны добрымі людзьмі, за якіх не будзе сорамна, якімі можна ганарыцца. Узяць, напрыклад, ужо дарослых — тых, каму ў 2020-м спаўняецца дваццаць, чый узрост заўжды будзе супадаць з парадкавым нумарам года. Яны ўжо сказалі пра сябе не толькі ў краіне, але і ў свеце. У гэтай падборцы мы раскажам менавіта пра іх, равеснікаў XXI стагоддзя. Упэўненыя: толькі пра некаторых з многіх.**

## Галоўнае — верыць у цуды і сілу думкі

Праз некалькі месяцаў пасля Новага года лічбу ў сваім узросце з 19 зменіць на 20 і студэнтка сталічнага факультэта журналістыкі і карэспандэнт Белтэлерадыёкампаніі Анастасія Рудзкая. За гэты час яна мела нямала асабістых дасягненняў, знайшла прэстыжную, а галоўнае, любімую работу. А за апошні год стала «Чалавекам года журфака», «Вядучай года БДУ» і выйграла конкурс «Фестываль эстрады БДУ» ў намінацыі «канферанс».

Бацькі заўсёды казалі дачцэ: «Калі штосьці не зробіш, будзе горш не іншым, а табе». І Насця старалася іх не падводзіць. Падчас вучобы ў школе былі думкі паступаць і ў медыцынскі, і на юрыдычны... Але, у рэшце рэшт, дзяўчына выбрала журналістыку.

З усмешкай яна згадвае свой першы матэрыял: «Патэлефанавала ў рэдакцыю газеты, дзе далі заданне зрабіць апытанку мінакоў аб рабоце дворнікаў. Я з радасцю яго прыняла, але потым... забыла! Як зараз помню, што была зіма, катаюся на санках — і раптам успамінаю: «Матэрыял! Так і пайшла, з гэтай лядзянкай, у гарналыжным касцюме, распытваць барабічан. Пасля — за камп'ютар...»

Яе плённая праца і ўпэўненасць у сабе спачатку дазволілі стаць трэцяй сярод абітурыентаў пры паступленні. А ўжо ў канцы першага курса прыйшлі на кастынг у перадачу «ПІН_КОД», куды заўсёды шукаюць маладых і крэатыўных, і паспяхова прайшла яго. «Нам задавалі пытанні, накшталт «А як бы вы паводзілі сябе ў гэтай сітуацыі», «Якое выйсце знайшлі б з гэтай праблемы»... — успамінае студэнтка. Так яна пачала сумяшчаць вучобу з работай. Трошкі пазней стала рыхтаваць сюжэты і для перадачы «Добрай раніцы, Беларусь». Каб даведацца пра шматлікія прафесіі, пабывала ў розных амплуа: хакеісткі, снаўбардысткі, пажарнай...

Пра гэта карэспандэнтка расказвае з радасцю і бляскам у вачах. Бо яшчэ з дзяцінства, гледзячы тэлевізар, уяўляла сябе па той бок экрана і верыла, што будзе скараць самыя высокія вяршыні. Аднак сказаць, што работа даецца ёй лёгка, дзяўчына не можа. «За сюжэтам на тры-чатыры хвіліны стаіць вялізная работа, — адзначае яна. — Мы шукаем тэму, дамаўляемся з людзьмі, пішам сцэнарый. Потым трэба зманціраваць адзнятае разам з тэхнічным рэдактарам, паставіць у эфір. А яшчэ ж трэба памятаць, што ў кожнай машыны, камеры — пэўны графік. І пад іх трэба падладжвацца...»



На мяжы дзесяцігоддзяў Насця можа падвесці вынік: за свае 19 было шмат нагод для гонару. І ва ўяўным спісе насупраць задач «вучоба» і «работа» пакуль можна паставіць тлустую птушачку. А вось загадваць на наступныя 20 гадоў яна не можа. Лепш убачыць, што атрымаецца на самай справе. Адзінае ведае дакладна: будзе свая сям'я, шчыра пабудаваная кар'ера, справа, якая прынясе задавальненне. «Самае галоўнае для мяне, — кажа студэнтка, — быць у моманце. На тым месцы, дзе адчуваеш сябе камфортна, і з тымі людзьмі, якія і павінны быць побач».

А вось планы на Навагоднюю ноч былі даўно. Яе, па традыцыі, правядзе з самымі блізкімі — мамай, татам, бабулямі і дзядулямі. У сям'і заўсёды пануе самая ўтульная і святочная атмасфера. 31 яны збіраюцца і разам гатуюць, накрываюць на стол, на якім ніколі не застаецца месца. А ў 12 пад бой курантаў ціха стаяць, а Анастасія думае пра самае лепшае, што абавязкова павінна спраўдзіцца ў новым годзе. Бо верыць у цуды і сілу думкі.

**Юлія АДАМОВІЧ.**
**Фота з сацсетак гераіні.**

### Навагодні бліц:

***— Што прыемней, дарыць, ці атрымліваць падарункі?***
**— Дарыць, канешне. Хоць і атрымліваць прыемна. Выберу абодва варыянты.**

***— Тры словы, з чым асацыіруецца Новы год?***
**— Яркасць. Ежа. Шчасце.**

***— А як жа мандарыны?***
**— А ў мяне на іх алергія! І на цукеркі таксама. Гэта нават не сумна, я ўжо прывыкла.**

***— Некалькі слоў, якім будзе 2020-ы.***
**— Такім, якім я захачу; напоўненым толькі пазітыўнымі эмоцыямі; паспяховым; здаровым. Ой, не! Давайце здароўе паставім на першае месца. Бо без яго не будзе нічога.**



## «Так проста я са спортам не развітаюся»

**Не сакрэт, што падчас пажару адлік часу зачастую ідзе на секунды. А жыцці людзей залежаць ад таго, наколькі ўмела і зладжана спрацуе ў экстрэмальнай сітуацыі разлік пажарных. Таму асаблівую ўвагу яны ўдзяляюць фізічнай падрыхтоўцы і спорту. Прычым незвычайнаму — пажарна-выратавальнаму.**

Даніілу ЛАМЕЙКУ 20 гадоў споўніцца ў 2020-м. Але ў паслужным спісе юнака ўжо значыцца работа прафесійным пажарным і вельмі паспяховыя выступленні на спартыўных спаборніцтвах. Але пра ўсё па парадку.

— Я пачаў займацца гэтым спортам, калі мне было шэсць год. Сур'ёзна ўцягнуўся, калі споўнілася дзесяць. Праўда, у дзяцінстве не думаў, што стану пажарным. Паступіў у машынабудаўнічы каледж, але пасля неяк перагарэў да гэтай справы. А вось цяга да прафесіі ратавальнікаў засталася.

Першыя крокі ў спорт Даніїл зрабіў дзякуючы свайму бацьку Дзмітрыю. Ён трэніруе юнацкую зборную Беларусі па пажарна-выратавальным спорце.

— Да шэрагаў ратавальнікаў я далучыўся год таму. Спачатку шэсць месяцаў працаваў дыспетчарам, пасля перавёўся ў баявы разлік. Ці складана было спачатку? Насамрэч работа дыспетчара не такая простая, як гэта можа здацца. Пастаянны псіхалагічны ціск, калі ты разумееш, што ў любы момант можа зазваніць тэлефон, а на тым канцы драта адбываецца бяда. А табе трэба быць заўжды напагатове, каб усё правільна пачуць, запісаць і зразумець. Але лічу, што такі досвед вельмі добры. Цяпер жа ў мяне графік просты — дзень я працую, на наступны некалькі гадзін прысвячаю трэніроўкам і пасля дзень адпачываю. На зборы нас, вядома, адпускаюць. Яны бываюць чатыры-пяць разоў на год.



— Але менавіта як сумяшчаецца спорт са службай?

— Усяго ў пажарна-выратавальным спорце існуюць чатыры віды. Гэта стаметровая паласа з перашкодамі, пераадоленне штурмавой лесвіцы, баявое разгортванне і эстафета. Больш за ўсё мне падабаецца штурмавая лесвіца. З самага дзяцінства любіў па ёй лазіць. Узняцца па ёй можна на першы паверх, а калі трэба вышэй — проста перакідваць уручную. Выкарыстоўваецца яна і на баявых выездах.

Юнак яшчэ некалькі гадоў таму стаў майстрам спорту. У яго паслужным спісе — і ўзнагароды міжнародных спаборніцтваў.

— Наша каманда ўпершыню выйграла чэмпіянат свету ў 2014 годзе ў Чэхіі ва ўзроставай катэгорыі малодшай групы. Але памятаю, што на штурмавой лесвіцы заняў толькі дзясятае месца. Што і казаць, быў слабаваты фізічна. Пры гэтым істотная канкурэнцыя ніякіх шанцаў не давала. Я не здаваўся, працягваў трэніравацца. І вось у 2018-м у балгарскай Варне, дзе праходзіў чарговы чэмпіянат свету, я здабыў перамогу ў гэтай намінацыі.

Прычым адметна, што гэтая вяршыня скарылася Даніілу Ламейку не першая. За два гады да таго шаснаццацігадовы юнак лепш за ўсіх на планетарным спаборніцтве прабег стаметроўку з перашкодамі. Прычым бар'еры ў вышыню дасягалі двух метраў, а яшчэ трэба было прабегчы па бервяне і спусціцца з яго па нязручнай лесвіцы.

— Мой рэкорд — 16,05 секунды. Але сусветны — 14,85. Ёсць да чаго імкнуцца! Тым больш што ў нашай справе трэба сябраваць з кожным відам спорту.

Але ці ўсім можна займацца пажарна-выратавальным спортам?

— Паспрабаваць свае сілы можа кожны. Галоўнае — мець жаданне, цярпенне, імкненне. І тады пры наяўнасці фізічных даных можна будзе дасягнуць вынікаў. У звычайным жыцці гэта цудоўнае хобі, дзякуючы якому вы падцягнеце фізічную падрыхтоўку, выпрацуеце дысцыпліну. Тут можна знайсці новых сяброў. Але і траўму можна атрымаць вельмі лёгка — дастаткова ўсяго аднаго памылковага руху.

На пытанне, якім юнак бачыць сябе праз пяць гадоў, Даніїл адказаў не адразу. Але ён цвёрда ведае, што так проста з пажарна-выратавальным спортам развітвацца не будзе. А пакуль што ён у свой вольны час рыхтуецца да чарговых рэспубліканскіх спаборніцтваў, якія пройдуць у сакавіку ў Барысаўскім раёне.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**